ГОМЕЛЬСКАЯ ОБЛАСТЬ

# Игровой модуль «Занимательные кубики»




г. Мозырь

# Содержание


- «Занимательные кубики»
- «Музыкальные дорожки»
- «По страницам безопасности»
- «На поиски пиратского клада»
- «Сказочные чудеса»
- «Волшебные палочки»
- «Экологическая пирамида»
- «Чудо-дерево»
- «Юные туристы»
- «Волшебный коврик»
- «Художники – детям про всё на свете»
- «Быстрая черепаха»
- «Сервировка стола»
- «Бабушкины коврики»
- «Ёлочка»
- «Сказка за сказкой»
- «Мая Беларусь»

**Игровой модуль «Занимательные кубики» состоит из 15 кубов, в каждом из них находится дидактическая игра или игрушка. Предложенный материал способствует реализации учебной программы дошкольного образования, разработан с учетом современных подходов к образовательному процессу и позволяет обеспечить личностно - ориентированный подход.**


БЕЛАРУСЬ — НАША РАДЗІМА
ДОРОЖНЫЕ ЗНАКИ
summertime
Мая Беларусь

# Дыдактычная гульня
# “Мая Беларусь”

**Узроставая адраснасць:** для дзяцей 4-6 гадоў.

**Мэта:** фарміраванне ў дзяцей уяўленняў аб карце Беларусі, яе межах, умення складаць карту з асобных частак; развіццё ўвагі, вобразна-схематычнага мыслення; выхаванне павагі да сваёй Радзімы.

**Дыдактычны матэрыял:** гульнявое поле, карткі-вобласці Беларусі.
**Гульнявыя дзеянні:** браць па адным элеменце, называць вядучаму вобласць, абласны горад.

**Ход гульні:** у гульні прымаюць удзел ад 1 да 3 выхаванцаў. Педагог прапануе разгледзець картку і дапасаваць яе да той часткі карты, якая адпавядае яе межам. Назваць абласны горад, вобласць. Калі гуляючы не спраўляецца з заданнем, яму дапамагаюць астатнія дзеці. У канцы гульні ўсе часткі карты знаходзяцца на адпаведным месцы.

## Дыдактычная гульня “Наш герб”

**Узроставая адраснасць:** старэйшы дашкольны ўзрост.

**Мэта:** фарміраваць уяўленні дзяцей аб Дзяржаўным гербе Беларусі, яго выглядзе і значэнні элементаў; развіваць зрокавую памяць, уважлівасць; выхоўваць павагу да дзяржаўных сімвалаў (інтарэс да паходжання і значэння асобных элементаў герба).

**Дыдактычны матэрыял:** выява Дзяржаўнага герба, гульнявое поле, карткі з рознымі выявамі сапраўдных і хлуслівых (няправільных, памылковых) элементаў герба.
**Гульнявыя правілы:** браць па адным элеменце, расказваць вядучаму, што ён абазначае.
**Гульнявыя дзеянні:** адбор патрэбных выяў.

**Ход гульні:** у гульні прымаюць удзел ад 2 да 4 выхаванцаў. Вядучы прапануе дзецям выбраць сапраўдныя элементы Дзяржаўнага герба. Двое або больш выхаванцаў па чарзе дапасуюць выбраныя элементы. Вядучы пытаецца, што абазначае той ці іншы элемент, сочыць, каб элементы каля герба былі сапраўднымі. Калі гуляючы не ведае значэння якога-небудзь элемента, яму дапамагаюць іншыя дзеці. У канцы гульні каля Дзяржаўнага герба знаходзяцца ўсе сапраўдныя элементы, астатнія застаюцца у тым месцы, дзе знаходзіліся у пачатку гульні.

## Дыдактычная гульня “Мая малая Радзіма”

**Узроставая адраснасць:** старэйшы дашкольны ўзрост.

**Мэта:** замацоўваць у дзяцей уяўленні аб знаёмых мясцінах роднага горада, аб будынках; развіваць уменне бачыць прыгажосць і своеасаблівасць кожнай пабудовы; выхоўваць пачуццё гонару за свой горад.

**Дыдактычны матэрыял:** гульнявое поле, карткі з выявамі (малюнкамі) будынкаў, помнікаў.

**Гульнявыя правілы:** браць па адным элеменце; расказваць вядучаму, што намалёвана на картцы, дзе знаходзіцца гэты помнік або пабудова.

**Гульнявыя дзеянні:** пошук патрэбных картак, іх тэматычнае аб'яднанне.

**Ход гульні:** у гульні прымаюць удзел двое выхаванцаў. Вядучы прапануе дзецям выбраць картку, расказаць, што на ёй намалёвана, дзе знаходзіцца помнік або пабудова. Калі аб'ект знаходзіцца ў Мазыры, то дзеці павінны пакласці картку на гульнявое поле.

## Дыдактычная гульня "Беларускі арнамент"

**Узроставая адраснасць:** сярэдні, старэйшы дашкольны ўзрост.

**Мэта:** замацоўваць у дзяцей уяўленні аб беларускім арнаменце, яго элементах; практыкаваць у стварэнні дэкаратыўных кампазіцый, выкарыстоўваючы элементы геаметрычнага і расліннага арнаменту; развіваць цікавасць да беларускага мастацтва; выхоўваць творчыя здольнасці, эстэтычны густ.

**Дыдактычны матэрыял:** лісты паперы, алоўкі.

**Гульнявыя правілы:** разгледзець выявы арнаменту, назваць яго элементы, скласці і намаляваць свой арнамент.

**Гульнявыя дзеянні:** маляванне арнаменту.

**Ход гульні:** педагог прапануе дзецям разгледзець розныя выявы беларускага арнаменту, назваць іх элементы, колеры, які выкарыстоўваецца пры яго стварэнні. Потым выхаванцы самастойна ствараюць свой асабісты арнамент або паўтараюць той, што намаляваны на гульнявым полі.

**Аўтар:** Мазановіч Алена Генадзьеўна, намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці ДУА "Яслі-сад №21 г. Мазыра".



**Республика Беларусь**
**Гомельская область**
**г. Мозырь**
**ул. Ленинская, 4**
**Отдел образования, спорта и туризма**
**Мозырского райисполкома**
**Телефон 80236 322148**
**Факс: 80236 323435**
**E-mail: doshkolsektor@mozyrro.by**